УДК 373.3.016:811.161.3

# СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

**Макей Яніна Станіславаўна**
настаўнік пачатковых класаў
УА "Дзяржаўная сярэдняя школа № 3 г. п. Зэльва"
г. п. Зэльва, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** Правільна арганізаваная маўленчая дзейнасць на ўроках беларускай мовы стварае аптымальныя ўмовы для ўзбагачэння і актывізацыі лексічнага запасу малодшых школьнікаў. У артыкуле паказаны магчымасці сучасных адукацыйных падыходаў у павышэнні эфектыўнасці урокаў беларускай мовы.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Працуючы многа гадоў у рускамоўных класах, мы заўважылі, што вучні сутыкаюцца са значнымі цяжкасцямі ў засваенні беларускай мовы і літаратурнага чытання. Мова як вучэбны прадмет не цікавіць дзяцей, таму і засвойваецца цяжка. Школьнікі маюць бедны лексічны запас, пры размове робяць памылкі ў пабудове сказаў, няправільна ставяць націск, не разумеюць многіх слоў. А калі вучоба цяжка даецца, тады ўрок ператвараецца ў складанае выпрабаванне.

Самае небяспечнае ў школе – гэта фармальныя веды, атрыманыя без цікавасці, без станоўчых адносін да вывучаемага матэрыялу: яны стануць непатрэбнымі, бо не будуць актыўна прымяняццца на практыцы, выклікаць жадання працаваць з захапленнем. Менавіта ў пачатковых класах павінны быць створаны ўмовы, каб дзіця хацела размаўляць на беларускай мове, умела любавацца мілагучнасцю беларускага слова, актыўна папаўняла свой лексічны запас.

Што павінен зрабіць настаўнік, каб вучні ішлі на ўрок з задавальненнем? Галоўная задача кожнага настаўніка – не толькі даць навучэнцам пэўную суму ведаў, але і развіць у іх цікавасць да навукі, навучыць вучыцца. Без добра прадуманых метадаў навучання цяжка арганізаваць засваенне праграмнага матэрыялу. Зрабіць урок займальным, непаўторным, цікавым, на нашу думку, дапамагае выкарыстанне разнастайных актыўных метадычных форм і прыёмаў, якія стымулююць творчую маўленчую дзейнасць. Актыўныя метады навучання – гэта метады, якія пабуджаюць вучня да актыўнай мысліцельнай і практычнай дзейнасці [2].

Якуб Колас пісаў: "Толькі тады веды робяцца нашым сталым набыткам, калі мы прыходзім да іх, здабываем іх самі". Самыя каштоўныя і трывалыя веды не тыя, што засвоены шляхам вывучэння, а тыя, што здабыты самастойна, падчас творчых пошукаў. Галоўнае на ўроку – стварэнне ўмоў для актыўнай работы кожнага вучня, спалучэнне індывідуальных, групавых, парных і калектыўных форм работы.

Гульня – выдатны сродак навучання, які стварае ўмовы для папаўнення слоўнікавага запасу вучняў. Лексічныя гульні пашыраюць і актывізуюць слоўнік вучня, развіваюць уменне падбіраць патрэбнае па сэнсе слова і вызначаць значэнне слоў. У такіх гульнях дзеці вучацца апісваць прадметы, выдзяляюць характэрныя іх прыкметы, адгадваюць па апісанні, знаходзяць прыкметы падабенства і адрознення, вучацца разважаць. Слоўныя гульні развіваюць у малодшых дзяцей не толькі маўленне, уменне аналізаваць і апісваць, яны развіваюць іх кругагляд,



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

разумовыя здольнасці. Гэта такія гульні, як “Зычны – галосны”, “Скажы наадварот”, “Чые галасы?” і іншыя. Для фарміравання выразнасці маўлення выкарыстоўваем гульні-карагоды і гульні-драматызацыі. Малодшых школьнікаў вабіць іх песеннасць і драматызаванасць дзеяння. Удзел у гульнях (“Бярозка”, “Заінька”) спрыяе ўзбагачэнню слоўніка вучняў вобразнымі эпітэтамі, ласкавымі словамі.

Рыхтуючыся да ўрокаў беларускай мовы, сваю першасную задачу бачым у стварэнні станоўчай матывацыі для разгорнутых выказванняў вучняў. Асноўнымі відамі практыкаванняў, што выкарыстоўваюцца для фарміравання ў малодшых школьнікаў патрэбнасці ў моўных зносінах, з’яўляюцца: 1) стварэнне маўленчых сітуацый, выбар іх са шматлікай колькасці вучэбных заданняў; 2) любыя віды дзейнасці, якія могуць выклікаць жаданне выказацца; 3) маляванне, вядзенне запісаў і дзённікаў; 4) стварэнне сюжэтаў па ўяўленні, у тым ліку і казачных.

На арганізацыйным этапе ўрока неабходна псіхалагічна падрыхтаваць вучняў да зносін. Мэтазгодным і прадуктыўным будзе выкарыстанне на этым этапе метадаў стварэння спрыяльнай атмасферы, у аснову якіх пакладзена “камунікатыўная атака”: “Памяняемся месцамі”, “Падары кветку”, “Алфавіт”.

Школьнікам прапаноўваюцца заданні праблемнага характару, шляхі выканання якіх ім невядомы. Вучань павінен знайсці спосаб вырашэння задання, абапіраючыся на веды і ўменні, якімі ён ужо валодае. Так узнікае супярэчнасць паміж веданнем і няведаннем, што падштурхоўвае дзіця да актыўнай мысліцельнай дзейнасці з мэтай пошуку адказу. Тыпы праблемных сітуацый, якія выкарыстоўваюцца на ўроках: сітуацыя нечаканасці; сітуацыя канфлікту; сітуацыя неадпаведнасці; сітуацыя нявызначанасці; сітуацыя здагадкі; сітуацыя выбару. Выкарыстанне такіх заданняў прадугледжвае індывідуальную працу на картках, работу ў групах.

Арганізацыя групавой работы дазваляе значна павялічыць колькасць часу для актыўнай размовы кожнага вучня, паколькі прадугледжвае сумеснае абмеркаванне, выказванне ўласных суджэнняў, дыскусію [3, с. 11]. Для працы ў групах выкарыстоўваецца метад “Бура прапаноў”, метады “Ранжыраванне” і “Чатыры куты”. Пры такім спосабе навучання ацэньваецца якасць творчай работы, правільнасць супастаўлення пунктаў гледжання, узаемадапамога і рацыянальнасць падыходаў да самастойнага выканання заданняў. Гэта дае магчымасць вучням з нізкім узроўнем ведаў адчуць сябе камфортна і не баяцца няправільных адказаў. Настаўнік сочыць за сваім маўленнем і не ўжывае выразаў нак-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

шталт: “Ты зрабіў гэта няправільна”, а пытаецца: “Чаму ты так зрабіў?”, сцвярджае: “Ведаю, што вы здольны на большае”, “Упэўнены, што вы дапаможаце тым, у каго будзе ў гэтым патрэба”. Больш за тое, створаная на ўроку сітуацыя поспеху дазваляе вучню атрымліваць станоўчыя адзнакі, бо з мноства прапанаваных заданняў ён выбера менавіта тое, якое зможа выканаць [1, с. 11].

Для выпрацоўкі асабістага пункту гледжання, здольнасці абгрунтаваць яго доказамі выкарыстоўваецца тэхналогія развіцця крытычнага мыслення (РКМ). Прыёмы тэхналогіі РКМ, якія мы выкарыстоўваем на ўроках беларускай мовы, – гэта “Кластар”, “Сінквейн”, “Ведаю. Хачу даведацца. Даведаўся” і іншыя.

Удасканаленне маўленчых навыкаў дасягаецца за кошт пастаянных маўленчых зносін. У звычайным класе камунікацыя мінімальная. Калі ж праводзіць заняткі з дапамогай калектыўнага спосабу навучання, школьнікі змогуць мець зносіны на дзвюх мовах на працягу ўсяго адведзенага часу. Якім жа чынам можна арганізаваць падобныя заняткі ў пачатковай школе?

Для правядзення заняткаў неабходна мець шмат тэкстаў на дзвюх мовах. Вучні працуюць у парах, маючы адзін і той жа тэкст, але на розных мовах. Дзеці дамаўляюцца, хто з іх на якой мове будзе працаваць. Адзін з вучняў чытае першы абзац, дапусцім, на рускай мове. Другі яго ўважліва слухае, калі трэба – папраўляе. Затым яны задаюць адно–два пытанні па першым абзацы на рускай мове і адказваюць на іх па чарзе. Пасля гэтага другі партнёр чытае гэты ж абзац, але ўжо на беларускай мове. Далей праца ў пары праходзіць аналагічна, як і з рускім тэкстам, толькі навучэнцы задаюць пытанні і адказваюць на беларускай мове. Падзякаваўшы адзін аднаму за дапамогу, яны мяняюцца тэкстамі і пераходзяць да новага партнёра, якому пераказваюць змест першага абзаца на той мове, на якім напісаны яго тэкст. Затым чытаюць наступны абзац, па якім працуюць аналагічна, гэтак жа, як і ў першай пары. Праца над тэкстам завяршаецца выступленнем перад класам або малой групай.

У першым класе, калі тэхніка чытання ў дзяцей яшчэ слабая, лепш браць невялікія тэксты, якія вучні прачытваюць цалкам на адной мове, затым задаюць па чарзе адзін аднаму пытанні. Пасля гэтага тэкст чытаюць (таксама цалкам) на другой мове, на гэтай жа мове задаюць пытанні і адказваюць на іх. Затым пара пакідае свае тэксты на стале і шукае сабе новага партнёра і новыя тэксты. Праца з новым партнёрам адбываецца па аналогіі з папярэднім.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Заняткі заканчваюцца агульным абмеркаваннем. Вучні расказваюць пра тое, якія тэксты ім асабліва спадабаліся, што б яны прапанавалі абавязкова прачытаць усім навучэнцам, што новага даведаліся, якія новыя словы або выразы запомнілі. Вельмі важна заўсёды адзначаць працу сваіх партнёраў: з кім было цікава працаваць, якія новыя прыёмы ў працы выкарыстоўваліся, якія цяжкасці адчувалі.

Сучасны ўрок беларускай мовы, як і іншыя ўрокі, не магчымы без выкарыстання інфармацыйных тэхналогій, электронных навучальных дапаможнікаў, інтэрактыўнай дошкі.

Такім чынам, выкарыстоўваючы сучасныя падыходы да выкладання беларускай мовы, педагог можа выклікаць і падтрымліваць у навучэнцаў непасрэдную цікавасць да роднай мовы, у пэўнай меры пераадольваць іх эмацыянальную няўстойлівасць, засяроджваць увагу на моўных з'явах, з якімі іх знаёміць. Выкарыстаныя метады і прыёмы садзейнічаюць не толькі фарміраванню ўменне выражаць свае пачуцці ў час маўлення, але і выклікаюць у вучняў маўленчую актыўнасць.

## Спіс літаратуры


1. Богданович, О. Н. Современные формы организации учебно-воспитательного процесса: практическое пособие для педагогов общеобразовательных учреждений / О. Н. Богданович. – Мозырь : ООО ИД «Белый Ветер», 2009. – 102 с.
2. Загурская, Е. Л. Использование активных форм и методов обучения в работе с младшими школьниками : метод. пособие / Е. Л. Загурская. – Мозырь : ООО ИД "Белый Ветер", 2006. – 56 с.
3. Сыско, І. Г. Шляхі да роднай мовы: сучасныя падыходы да выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / І. Г. Сыско. – Мазыр : Содействие, 2011. – 72 с.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова